Ці будуць сёлета пілігрымкі?

Аўтар: Арцём Ткачук
01.05.2022 21:16

Пандэмія перарвала шматгадовую традыцыю пешых паломніцтваў у беларускія санктуарыі. Ужо два гады вялікія арганізаваныя пілігрымкі не ходзяць. Пытанне, ці адбудуцца паломніцтвы ў гэтым годзе, таксама застаецца адкрытым. ***“Чакаем рашэння біскупаў, але апошняе слова застаецца за ўладамі”***
, – кажуць кіраўнікі пешых груп.

Два гады без пілігрымак

Пачатак пандэміі зімой 2020 года паставіў пад пытанне правядзенне не толькі пешых паломніцтваў, але і саміх фэстаў у Будславе і дыяцэзіяльных санктуарыях. Тады за паўтары месяцы да фэсту ККББ абвясціла аб яго пераносе, аднак па ініцыятыве арцыбіскупа Кандрусевіча мерапрыемства ўсё ж адбылося ў фармаце парафіяльнага свята. Пра арганізацыю пешых пілігрымак не ішло нават мовы.

Нягледзячы на абмежаванні першага года пандэміі, вернікі самаарганізоўваліся ў невялікія паломніцкія групы і крочылі ў санктуарыі. У 2021 годзе ККББ аб’явіла, што Будслаўскі фэст адбудзецца, але “без арганізаваных пілігрымак”. Разам з гэтым іерархі нагадалі, што “ахвотныя могуць ладзіць паломніцтвы ў індывідуальным парадку”. Хваля такіх груп летась ужо была значна большай, чым годам раней.

Аўтар: Арцём Ткачук
01.05.2022 21:16

Ці вернуцца вялікія арганізаваныя групы?

Кс. Павел Рудзьман, адказны за пілігрымку Баранавічы–Будслаў, адзначае, што арганізатары пешых паломніцтваў у Нацыянальны санктуарый чакаюць рашэння Канферэнцыі біскупаў. ***“Калі гэтае рашэнне будзе прынята, адказныя ўжо зоймуцца непасрэднай падрыхтоўкай”*** , – распавядае ксёндз.

Рашэння біскупаў чакаюць таксама ў Гродне і Віцебску. ***“Яшчэ нічога не вядома, ёсць шмат нюансаў”*** , – каменціруе кс. канонік Антоній Грэмза. Канцлер Віцебскай дыяцэзіі кс. Віктар Місевіч пацвярджае, што ў любым выпадку апошняе слова будзе за дзяржаўнымі ўладамі, бо “

гэта масавае мерапрыемства па-за мурамі касцёлаў, якое трэба ўзгадняць”. “Калі згода будзе, то пілігрымкі адбудуцца,

– выказвае шчырае спадзяванне кс. Віктар.

–

Хацелася б, каб яны пайшлі, вярнуліся да нармальнага, але пакуль што цяжка адказаць на гэтае пытанне”

.

У сваю чаргу прадстаўнікі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі кажуць, што пачынаюць падрыхтоўку да пілігрымак. Кс. Алег Шпець TChr, адказны за групу Мінск–Будслаў, адзначае, што на гэты конт ужо адбылася размова з арцыбіскупам Юзафам Станеўскім, і ***“ён сказаў, што будзем праводзіць пілігрымкі”. “Пакуль канкрэтыкі яшчэ мала, але кавідныя абмежаванні не з’яўляюцца перашкодай”****,* – дадае святар. А. Андрэй Жылевіч пацвярджае, што капуцыны ўжо маюць вызначанага каардынатара пілігрымкі Маладзечна–Будслаў і пачалі неабходную падрыхтоўку.

Ці чакаюць вернікі вяртання паломніцтваў?

Цяпер папулярныя індывідуальныя пілігрымкі і паломніцтвы невялічкімі групамі “

Прынамсі, у мяне ніхто не пытаўся пра пілігрымкі. Асабіста не бачу асабліва вялікага энтузіязму”

, – каменціруе кс. Грэмза. З гэтым меркаваннем згаджаецца і кс. Рудзьман:

“Гэта праблема сучаснага чалавека, яго самаарганізацыі. Хто хацеў, той хадзіў і летась, і пазалетась”

.

Некаторыя суразмоўцы згадваюць праблему начлегаў. Пасля кавідных абмежаванняў

многія вернікі і кіраўнікі школ з дыстанцыяй ставяцца да прыняцця пілігрымаў пад свой дах. ***“Накарміць людзей не праблема, пытанне хутчэй у тым, ці гатовыя пілігрымы ўзяць з сабой палаткі***, – адзначае кіраўнік баранавіцкай пілігрымкі. – ***У той жа час, каб паставіць палатачны гарадок, таксама патрэбен адпаведны дазвол”***.

Кс. Дзмітрый Дубовік прыводзіць прыклад, што парафія ў Ваўкалатах, суседка санктуарыя ў Будславе, штогод прымала да 800 паломнікаў з Віцебскай дыяцэзіі. ***“Тамтэ йшы пробашч кажа, што сёлета змогуць прыняць добра, калі палову***,
– распавядае будслаўскі кусташ. –
Людзі не вельмі гатовыя прымаць пілігрымаў”.

Ці стане Будслаў беларускім Санцьяга-дэ-Кампастэла?

Кс. Рудзьман мяркуе, што, ***“магчыма, ужо прыйшоў час такіх пілігрымак, як у Санцьяга-дэ-Кампастэла”. “Гэта працавала апошнія два гады. Людзі хадзілі сваімі маленькімі групкамі. Як бы дзіўна не гучала, для мяне гэта было большым перажываннем, чым калі ідзе вялікая група.***
У шматлюднай групе я служу. А калі ідзеш з невялікай колькасцю людзей, то ёсць неверагоднае пачуццё малітвы пад спеў птушак, шум ветру ці цурчанне ручая. Мне падаецца, што тыя, хто паспрабаваў ісці самастойна, ужо не захочуць ісці з масавай групай. І я гляджу на гэта пазітыўна”, – адзначае святар.

На дадзены момант усе арганізатары пілігрымак чакаюць канчатковых рашэнняў біскупаў і дзяржаўных чыноўнікаў. Суразмоўцы маюць надзею, што ўсе дазволы будуць атрыманы. ***“Мы не будзем стартаваць з канкрэтнай падрыхтоўкай, пакуль не будзе дазволу ад улад”***, – кажа кс. Шпець.

Пакуль тэма сёлетніх будслаўскіх урачыстасцей на стадыі выпрацоўкі. ***“Арцыбіскуп папрасіў, каб мы падумалі і прадставілі ідэі, а ён, у сваю чаргу, падумае над сваімі прапановамі”***
, – распавядае кіраўнік мінскай пілігрымкі.

А кс. Грэмза ўжо пацвердзіў, што ўрачыстасці ў Тракелях пройдуць пад дэвізам “Аб супакоі”. У маі дакладна будзе вядомы лёс сёлетніх пілігрымак у Будслаў і іншыя санктуарыі.